Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманага з Пятром Рабавым хлопца абвінавачваюць у прапагандзе фашызму

24.11.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, сілавыя структуры



Як паведаміў Праваабарончаму цэнтру "Вясна" **Ілья Сянько**, які быў затрыманы 10 кастрычніка з расійскім філосафам і гісторыкам **Пятром Рабавым** у Баранавічах, 22 лістапада ў дачыненні да яго быў складзены пратакол за адміністрацыйнае правапарушэнне па арт. 17.10 КаАП - «Прапаганда і (або) публічнае дэманстраванне, выраб і (або) распаўсюджванне нацысцкай сімволікі або атрыбутыкі».

Малады чалавек праводзіў Пятра Рабава на цягнік пасля лекцыі ў Баранавічах увечары 10 кастрычніка і быў затрыманы разам з лектарам. Хлопца дапытвалі не па справе, схілялі да супрацоўніцтва, а калі ён адмовіўся - нават білі па галаве. Ноч ён правёў у ІЧУ, а раніцай быў дастаўлены ў суд. Яго абвінавачвалі ў "дробным хуліганстве" (арт. 17.11 КаАП), аднак, разгляд справы перанеслі на 13 кастрычніка. Тады суд адміністрацыйную справу спыніў "за адсутнасцю падзеі правапарушэння".

А між тым 12 кастрычніка ў доме, дзе Ілья Сянько пражывае, правялі ператрус супрацоўнікі ГУБАЗ, нібыта ў сувязі з падазрэннем хлопца ў распаўсюдзе і публічным дэманстраванні фашысцкай сімволікі.

> *"Мне было вельмі смешна ад такога абгрунтавання, таму што мае погляды прама процілеглыя фашызму. Вядома, супрацоўнікі нічога не знайшлі, але вырашылі забраць сістэмны блок камп'ютара, бо нібыта ён спрыяў такому распаўсюджванню. На мае словы пра тое, што кампутар не мой і аформлены на маю бабулю, не рэагавалі. Адначасна мяне пасыпалі брыткімі словамі з-за маёй знешнасці"*, - распавёў Ілля Сянько.

У выніку пратрусу ў маладога чалавека быў канфіскаваны жорсткі дыск, складзены пратакол аб канфіскацыі, аднак копію пратаколу яму ўручаць адмовіліся.

І вось праз месяц Іллю Сянько запрасілі ў Баранавіцкі ГАУС, каб ён забраў канфіскаваны жорсткі дыск, дзе ў той жа час участковы склаў на яго пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні па арт. 17.10, абвінаваціўшы ў прапагандзе і публічным дэманстраванні нацысцкай сімволікі.

> *«Грамадзянін Сянько І., знаходзячыся па месцы пражывання, з дапамогай персанальнага камп'ютара ў сацыяльнай сетцы "Укантакце", на сваёй старонцы пад імем "Ілля Краст" размясціў дзве фатаграфіі з выявай нацысцкай сімволікі, чым ажыццявіў публічнае дэманстраванне з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт, што было ўстаноўлена 12.20.2017 года ў 11.10»*, - запісана ў пратаколе участковым **Русланам Юрэнем**.

Хлопец паставіў подпіс, што з пратаколам не згодны, аднак, у бліжэйшы час чакае позвы ў суд.

> *«Вельмі крыўдна, бо на маёй старой старонцы "Укантакце" сапраўды былі размешчана некалькі фотаздымкаў з фашысцкай сімволікай, але ў высмейлівай форме! Аднак, да правядзення пратрусу, гэтыя фатаграфіі ўжо былі выдаленыя. Але ўсё гэта супрацоўнікаў міліцыі не збянтэжыла.*
>
> *Гэту адміністрацыйную справу я звязваю са сваёй грамадзянскай пазіцыяй і актыўнасцю і лічу, што такім чынам міліцыя хоча мяне ачарніць»*, - кажа малады чалавек.

Нагадаем, расійскі гісторык, філосаф і даследчык анархізму Пётр Рабаў быў затрыманы ўвечары 10 кастрычніка. Ён збіраўся вярнуцца ў Расію, але на цягнік сесці не паспеў. Разам з ім быў затрыманы Ілья Сянько, які суправаджаў Пятра Рабава на цягнік. Гісторыка асудзілі на шэсць сутак арышту, а пасля выслалі з Беларусі з забаронай уезду на дзесяць гадоў.

Таксама 9 кастрычніка лекцыю Пятра Рабава брутальна сарвалі супрацоўнікі міліцыі ў Гродна. Тады лектара і ўдзельнікаў затрымалі і даставілі ў ГУУС, аднак бліжэй да ночы адпусцілі.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

